Славутыя суайчыннікі

# ВОСІП КАЗЛОЎСКІ – ПЕДАГОГ, КАМПАЗІТАР, «ДЫРЭКТАР МУЗЫКІ» ІМПЕРАТАРСКІХ ТЭАТРАЎ

## Жыццёвы и творчы шлях музыканта з Прапойска



**М. М. Сакалоўская,**
старшы выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі

**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар культуралогіі, прафесар



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

**XIX ст. адметнае ростам нацыянальнай свядомасці беларускай інтэлігенцыі, з'яўленнем бліскучай плеяды творцаў, прыхільнікаў рамантызму, у якім спалучаліся рысы шляхецкага асветніцтва, дыдактызму і сентыменталізму. На Беларусі пачынае фарміравацца багатая разнажанравая літаратура (Т. Зан, А. Міцкевіч, Я. Чачот і інш.), актыўна развіваецца выяўленчае (М. Андрыёлі, В. Ваньковіч, А. Гараўскі, Н. Орда, Н. Сільвановіч і інш.) і музычнае (М. К. Агінскі, М. Гузікаў, М. Ельскі, Ф. Міладоўскі і інш.) мастацтва. У сузор'і згаданых славутых імён ярка зіхацела і імя Восіпа Антонавіча Казлоўскага (1757–1831 гг.) – знакамітага кампазітара, віяланчаліста, педагога.**

### Ад Прапойска да Пецярбурга

У айчынным музыказнаўстве праца па вывучэнні жыццёвага шляху і багатай творчай спадчыны Восіпа Антонавіча Казлоўскага толькі распачынаецца. У навуковай і папулярнай літаратуры Восіп Антонавіч часта згадваецца як рускі і польскі музычны дзеяч. Таму Б. Асаф'еў, І. Бэлза, Ю. Келдыш, О. Левашова, У. Пракоф'еў, Ю. Фартунатаў і іншыя рускія музыколагі прысвяцілі яго творчасці грунтоўныя даследаванні. Шмат навуковых і папулярных артыкулаў аб знакамітым кампазітары належаць таксама польскім аўтарам.

Сапраўды, музычную адукацыю Восіп Казлоўскі атрымаў у Варшаве, даволі працяглы час жыў у Пецярбургу, там жа быў прызнаны класікам рускага музычнага мастацтва даглінкаўскага перыяду. Справа ў тым, што ў XIX ст. на Беларусі па аб'ектыўных прычынах спынілі сваё існаванне многія славутыя музычныя цэнтры (Гродзенскі тэатр Тызенгаўза, Свіслацкі тэатр Ю. Тышкевіча, Слонімскі тэатр Міхала Казіміра Агінскага, Шклоўскі тэатр С. Зорыча і інш.). Таму шэраг беларускіх кампазітараў і выканаўцаў – А. Абрамовіч, М. Гузікаў, С. Манюшка, Н. Орда і інш. – вымушаны былі рэалізоўваць свае таленты за межамі Беларусі і там



здабываць усеагульнае прызнанне. Такі ж лёс напаткаў і Восіпа Казлоўскага.



Нарадзіўся будучы музыкант на хутары Казлоўскі непадалёк ад Прапойска (цяпер горад Слаўгарад) у сям'і беларускага шляхціца. Беларускае паходжанне Восіпа Антонавіча пацвярджае, у прыватнасці, вядомы рускі фалькларыст П. А. Бяссонаў: «...Белорус Козловский, также перелагатель песен, воспитавший на них целое поколение, композитор к стихам Державина, позднее к трагедиям Озерова, старший соперник Огинского в полонезах, артист в разнообразной композиции, капельмейстер и «Директор музыки...» [2, с. 338]. Беларускі гісторык А. Бабровіч знайшоў у вёсцы Сакалова Слаўгарадскага раёна старадаўнюю метрычную кнігу, у якой ёсць запіс аб нараджэнні В. Казлоўскага. У некралогах, змешчаных у расійскіх газетах за 1831 год, таксама паведамляецца, што Восіп Антонавіч Казлоўскі паходзіў з беларускіх дваран. Таму дадзеныя аб яго нараджэнні ў Варшаве, якія ўтрымліваюцца ў расійскім выданні «Творческие портреты композиторов» (1990 г.) і нават у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, з'яўляюцца памылковымі [7].

На жаль, нам амаль нічога невядома аб дзяцінстве будучага кампазітара і яго бацьках. Даследчыкі творчасці Казлоўскага толькі паведамляюць, што ў Восіпа вельмі рана праявіліся музычныя задаткі. Іх заўважыў дзядзька хлопчыка, знакаміты гусліст Васіль Трутоўскі і адвёз пляменніка ў сямігадовым узросце ў Варшаву. Там у капэле пры касцёле св. Яна таленавіты хлопчык спасцігаў майстэрства ігры на аргане і скрыпцы, а таксама займаўся вакалам. У падлеткавым узросце Восіп ужо вядомы ў музычным асяроддзі Варшавы. Сведчанне таму – прапанова, зробленая 16-гадоваму музыканту ў 1773 г. Андрэем Агінскім. Высокі саноўнік ВКЛ просіць Восіпа быць настаўнікам музыкі для яго сына Міхала Клеафаса і дачкі Юзэфы. Агінскія ў той час жылі ў маёнтку Гузава (непадалёк ад Варшавы). Тры гады выкладаў Восіп Казлоўскі юнаму князю тэорыю музыкі і развіваў выканальніцкія навыкі таленавітага хлопчыка. Падчас гэтых заняткаў юнакі пасябравалі і пранеслі свае шчырыя ўзаемаадносіны праз усё жыццё.

Настаўнік і вучань часта наведвалі слонімскую рэзідэнцыю вялікага гетмана літоўскага Міхала Казіміра Агінскага, які даводзіўся маладому князю дзядзькам. Галоўнае, што прыцягвала юных музыкантаў у Слонім – гэта музычны тэатр, на той час лепшы на тэрыторыі Беларусі. В. Дадзіёмава сцвярджае, што слонімскі «велізарны тэатр не мог не ўразіць маладога музыканта» прафесіянальным узроўнем, дасканаласцю мастацкага афармлення і багаццем рэпертуару» [4, с. 118]. Там выконваліся камерна-вакальныя і інструментальныя творы заходнееўрапейскіх кампазітараў, нярэдка гучалі і музычныя творы самога гаспадара рэзідэнцыі. Даследчыкі творчай спадчыны В. Казлоўскага мяркуюць, што канцэрты славутай слонімскай капэлы значна паўплывалі на фарміраванне слыхавога вопыту будучага кампазітара, а таксама абудзілі ў яго цікавасць да музычна-сцэнічнай творчасці.

У пачатку 1780-х гадоў Беларусь наведвае фаварыт Кацярыны II князь Пацёмкін, які валодаў тут Крычаўскай воласцю. Пачуўшы на адным з канцэртаў майстэрскае выкананне В. Казлоўскага, высокі расійскі саноўнік запрашае маладога музыканта ў Пецярбург. Пры падтрымцы ўсемагутнага князя Восіп імкліва ўзыходзіць па ваеннай кар'ернай лесвіцы. Асабліва хутка ён павышаецца ў званнях падчас руска-турэцкай вайны (1787–1791 гг.), калі яго апякун Р. Пацёмкін быў галоўнакамандуючым рускай арміі.

## Пецярбургскі перыяд

Восіп Казлоўскі быў уражаны адвагай і гераізмам рускіх саладат, якія яскрава праявіліся пры штурме і ўзяцці непрыступнай турэцкай крэпасці Ізмаіл. Свае пачуцці кампазітар увасобіў у святочным паланэзе «Гром победы, раздавайся!», які ўпершыню прагучаў 28 красакавіка 1791 г. у Таўрыцкім палацы князя Пацёмкіна ў прысутнасці больш за тры тысячы гасцей. Высокая сталічная публіка на чале з самой імператрыцай Кацярынай II сабралася тут з нагоды ўзяцця крэпасці Ізмаіл і канчатковай перамогі Расіі над Турцыяй. Для падрыхтоўкі ўрачыстага свята былі запрошаны лепшыя тагачасныя архітэктары, мастакі, паэты, музыканты. Славуты паэт Г. Дзяржавін пісаў па замове Пацёмкіна вершы для спеваў на свяце. Знакаміты прыдворны балетмайстар француз Ле Пік ставіў танцы. Сочыненне музыкі і дырыжыраванне хорам і аркестрам было даручана нікому тады яшчэ не вядомаму музыканту В. Казлоўскаму.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Хор і аркестр з трохсот чалавек выканаў твор Казлоўскага на вершы Дзяржавіна. Сталічная публіка была ўражана не толькі цудоўным вершам, але і ўрачыстай, бліскучай, поўнай святочнага трыумфавання музыкі. Паланэз вылучаўся эмацыянальнай прыўзнятасцю і маштабнасцю музычнага гучання. А неўзабаве твор пачынаючага кампазітара становіцца афіцыйным гімнам Расійскай дзяржавы.

Харавыя «застаўкі» панегірычнага плана становяць адметнасцю і пазнейшых музычных твораў Казлоўскага («Славься сим Екатерина», «Реквием в связи с кончиной короля Речы Посполитай Станислава Августа Понятовского» і інш.). Ф. Булгарын сведчыць: «Кароль Польскі памёр у лютым 98 года і пахаваны быў пышна, па царскім цырыманіяле. Requiem кампазіцыі В. А. Казлоўскага, выкананы ў каталіцкай царкве, тады быў высока ацэнены знаўцамі і часта паўтараўся ў духоўных канцэртах» [6, с. 129].

Пецярбургскі перыяд жыцця В. Казлоўскага надзвычай плённы для яго творчасці. Кампазітар піша шмат паланэзаў, менуэтаў, рамансаў, песень, займаецца музычным афармленнем афіцыйных урачыстасцей, свят пры дварах высокіх саноўнікаў Расійскай імперыі. У 1799 г. ён атрымлівае пасаду інспектара імператарскіх тэатраў, а з 1803 г. становіцца ў іх «дырэктарам музыкі». Знаёмства з артыстычным асяроддзем, з драматургамі выклікала ў Казлоўскага жаданне звярнуцца да стварэння музыкі для тэатра. І ў гэтым жанры кампазітар яскрава праявіў свой талент. Яго музыка, поўная мужнага пафасу, дакладна і выразна выяўляла характар сцэнічных герояў (гераічныя трагедыі «Эдып у Афінах» і «Фінгал» У. Озерова, «Уладзісан» Я. Княжніна, «Дебора» А. Шахоўскага і «Эдып цар» А. Грузінцава, «Эсфір» Ж. Расіна).

Сярод асабліва паспяховых – музычнае афармленне трагедыі Озерова «Фінгал». Драматург і кампазітар з'явіліся свайго роду пачынальнікамі такога папулярнага ў будучым жанра, як рамантычная драма. Суровы каларыт сярэднявечча, мужны вобраз шатландскага воіна Фінгала бліскуча ўвасоблены ў музыцы Восіпа Казлоўскага. Прэм'ера трагедыі «Фінгал» адбылася ў снежні 1805 г. Спектакль уразіў гледачоў раскошай пастаноўкі, цудоўнымі вершамі Озерова і пранікнёнай музыкай Казлоўскага. Ролі ў ім выконвалі лепшыя трагічныя акцёры.

Сумесна з У. Озеравым, А. Грузінцавым, а таксама А. Шахоўскім В. Казлоўскі стварае шэраг твораў у жанры меладрамы. На думку В. Дадзіёмавай, кампазітару «ўдалося стварыць цэласныя сімфанічныя палотны, віртуозна выкарыстоўваючы ўсе сродкі музычнай выразнасці. Гэтым творам было наканавана ў пэўнай ступені выканаць «функцыю замяшчэння» яшчэ не сфарміраванай на той час рускай сімфоніі» [3, с. 30].

У Пецярбургу В. Казлоўскі зноў, праз 30 гадоў, сустрэўся са сваім дзядзькам В. Трутоўскім. Сваяк служыў на той час пры імператарскім двары гуслістам, займаўся зборам і апрацоўкай славянскіх народных песень. Кампазітар пад уплывам Трутоўскага таксама пачынае займацца аранжыроўкай народных песень. Рускі гісторык Н. Трубіцын называе яго першым рускім этнографам, які стаў наведваць корчмы і харчэўні, вясковыя святы і прыслухоўвацца да народных спеваў. Вынікам гэтага захаплення Казлоўскага з'явіліся яго музычныя творы, напісаныя па матывах народных песень («Я птичкой быть желаю», «Пожалуйте, сударыня», «Лети к моей любимой» і інш.). У палітры вакальнай лірыкі Восіпа Антонавіча ёсць таксама шматлікія песні, напісаныя на італьянскія, польскія, французскія тэксты. Даследчыкі музычнай творчасці кампазітара справядліва лічаць яго адным з заснавальнікаў вакальна-драматычнага жанру, які аб'яднаў элементы літаратурнага, драматычнага і музычнага мастацтва.

Творчая спадчына В. Казлоўскага прадстаўлена таксама шматлікімі камерна-вакальнымі, інструментальнымі, харавымі і сімфанічнымі творамі. Аб высокім узроўні яго музычных твораў сведчыць, у прыватнасці, каментарый, змешчаны ў выдадзеным у сярэдзіне 1790-х гадоў зборніку: «Сей любитель музыки сими сочинениям сделался творителем нового рода Российских песен, которые по общему суждению всей музыкальной публики, весьма прекрасны, превосходят большую часть наилучших Французских, Немецких и Английских песен и ни в чем не уступают Итальянским» [6, с. 118].

Вакальныя і інструментальныя творы Восіпа Казлоўскага хутка набывалі шырокую папулярнасць, тыражыраваліся ў вялікай колькасці, нярэдка перапісваліся ад рукі, пастаянна выконваліся большасцю тагачасных музычных капэл.

Расійскія кампазітары 1-й паловы XIX ст., сярод якіх былі і кампазітары-беларусы, імкнуліся адаптаваць да айчыннай глебы заходнееўрапейскія жанры, іх эстэтычныя прынцыпы, адпаведную музычную лексіку. У шэрагу музычных твораў Казлоўскага, асабліва яго рамансах, выразна адчуваюцца заходнееўрапейскія інтанацыі. З'яўляючыся «дырэктарам музыкі» імператарскіх тэатраў, кампазітар актыўна садзейнічаў папулярызацыі ў Расіі заходнееўрапейскага музычнага мастацтва. У праграмы прыдворных канцэртаў ён уключаў сачыненні такіх кампазітараў, як І. Ф. Бенда, Я. Ваньхаль, П. Враніцкі і інш.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рабіў апрацоўкі іх твораў. Несумненна ўнясенне В. Казлоўскім заходнееўрапейскіх матываў ва ўсходнееславянскае музычнае мастацтва спрыяла развіццю апошняга і яго арганічнаму ўключэнню ў агульнаеўрапескую культурную прастору.

## Зноў на Радзіме

Нягледзячы на тое, што пераважная частка творчага шляху кампазітара звязана з Расіяй, Восіп Казлоўскі зрабіў значны ўклад і ў фарміраванне музычнай культуры Беларусі. Асабліва плённым быў уплыў яго музычнай спадчыны на творчасць Міхала Клеафаса Агінскага. Казлоўскі стаў не толькі настаўнікам, але і добразычлівым дарадцам і крытыкам, а таксама выдаўцом шэрага твораў Агінскага. Асабліва цесна абодва кампазітары супрацоўнічалі ў пецярбургскі перыяд іх жыцця, куды Міхал Клеафас прыехаў пасля эміграцыі (1802 г.). Тады ж В. Казлоўскі апублікаваў два зборнікі паланэзаў і рамансаў М. Агінскага на італьянскія і французскія тэмы. У сваю чаргу Міхал Клеафас на ўласныя сродкі апублікаваў два зборнікі музычных твораў В. Казлоўскага.

Творчае супрацоўніцтва і шчырае сяброўства двух нашых славутых суайчыннікаў працягвалася ўсё іх жыццё. Плённым яно было і ў залескі перыяд жыцця М. К. Агінскага. Паводле ўспамінаў графа Канстанціна Тышкевіча, «у розныя гады ў Залессі працяглы час жыў «дырэктар музыкі» імператарскіх тэатраў В. Казлоўскі, які ў сясцёр імператара быў настаўнікам музыкі, а ў дзяцінстве выкладаў музыку М. Агінскаму. Пайшоўшы ў ганаровую адстаўку з узнагародамі і вялікай пенсіяй, пераехаў у Залессе і на музычных імпрэзах іграў на віяланчэлі» [8, с. 84]. А. Залускі сведчыць, што ў музычных канцэртах, якія ладзіліся ў Залессі, часам прымала ўдзел і дачка Казлоўскага, якая выконвала партыю альта [5, с. 142]. У Залессі Восіп Антонавіч напісаў і шэраг арыгінальных музычных кампазіцый. Вынікам назірання кампазітара за жыццём залескіх сялян з'явілася яго музыка да сцэнічнага твора «Жнеі, або Дажынкі ў Залессі».

Апошнія гады жыцця Восіп Антонавіч правёў на сваёй радзіме, у Прапойску, дзе працягваў актыўную музычную дзейнасць. Паводле сведчання В. Бабровіча, ён быў дырыжорам аркестра графа Мурамцава [1, с. 618].

Аналіз музычнай спадчыны В. А. Казлоўскага дае падставы сцвярджаць, што ў яе аснове – традыцыі беларускай, рускай і польскай культуры. Творчае асэнсаванне народнага меласу дазволіла кампазітару стварыць шэраг значных вакальных і інструментальных твораў і тым самым узбагаціць усходнеславянскую музычную культуру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА


1. **Бабровіч, В.** Казлоўскі Восіп (Юзаф) Антонавіч / В. Бабровіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі у 5 т. Т. 2. Габой – Карціна. – Мінск: Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1985. – 702 с.
2. **Бессонов, П.** Наш век в русских исторических песнях / П. Бессонов, П. Киреевский // Песни, собранные П. В. Киреевским. Изданы обществом любителей российской словесности под редакцией и с дополнением П. Бессонова. – Вып. 10. – 1874.
3. **Дадзіёмава, В.** На мяжы стагоддзяў і эпох / В. Дадзіёмава // Мастацтва. – 1995. – № 3. – С. 28–29.
4. **Дадзіёмава, В. У.** Гісторыя музычнай культуры Беларусі да ХХ стагоддзя / В. У. Дадзіёмава. – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2012. – 230 с.
5. **Залуский, А.** Время и музыка Михала Клеофаса Агинского / А. Залуский. – Минск: Четыре четверти , 1999. – 189 с.
6. **Прокофьев, Вс.** Осип Антонович Козловский и его «Российские песни» / Вс. Прокофьев //Музыка и музыкальный быт старой России. – Л., 1927.
7. **Творческие портреты композиторов**. – М.: Музыка. 1990.
8. **Tyszkiewicz, Hr. Konstanty**. Wilija i jej brzegi / Hr. Konstanty. Tyszkiewicz. – Vilnius, 2008. – 362 с.


Падпісана да друку 15.08.2015. Папера афсетная. Фармат 60х84 1/8. Гарнітура «Georgia». Друк афсетны.
Фіз. друк. арк. 12. Ум. друк. арк. 11,16. Ул.-выд. арк. 10,1. Тыраж 1976 экз. Зак. 2009
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродка масавай інфармацыі №709 ад 30.07.2010, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Адрас рэдакцыі: 220023, Мінск, вул. Макаёнка, 12.
Афіцыйны сайт у Інтэрнэце www.n-asveta.by, адрас электроннай пошты info@n-asveta.by
Тэлефоны: 267-62-68, 267-64-69, 267-33-97.
Установа «Рэдакцыя газеты «Настаўніцкая газета» Філіял «Рэдакцыя часопіса «Народная асвета».
Падпісныя індэксы: 74967 (інд.); 749672 (вед.)

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» (ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004).
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79.